Источник: "Настаўніцкая газета" - 2012-04-26

# Якімі бачаць свае будучыя сем'і старшакласнікі?

**Таццяна Сушко і Лізавета Стома, 10-класніцы гімназіі № 1 Жодзіна, сталі пераможцамі міжнароднага форуму студэнцкай і вучнёўскай моладзі "Першы крок у навуку-2012", што прайшоў у НАН Беларусі. У намінацыі "Педагогіка. Псіхалогія" гімназісткі прадставілі работу "Ідэальная мадэль сям'і ва ўяўленні старшакласнікаў". Заняцца гэтай тэмай іх падштурхнуў крызіс традыцыйнай сям'і і хваляванне за яе будучыню.**



Першая школа жыцця для чалавека — гэта сям'я, але зараз інстытут сям'і перажывае глыбокі крызіс, гэта небяспечна для дзяржавы і чалавецтва ў цэлым, лічаць Таццяна і Лізавета (на здымку).

Для таго каб высветліць, як сучасная моладзь ставіцца да сям'і і як уяўляе яе ідэальную мадэль, даследчыцы апыталі старшакласнікаў сваёй гімназіі, усяго больш за 80 чалавек ва ўзросце 14—16 гадоў. Рэспандэнты выконвалі тэст Люшэра, малявалі сваю сапраўдную сям'ю і ідэальную, выказвалі свае адносіны да грамадзянскіх і аднаполых шлюбаў.

Падабраць даследчыя методыкі і інтэрпрэтаваць вынікі дапамаглі псіхолагі гімназіі і кіраўнік работы настаўніца грамадазнаўства і гісторыі Святлана Міхайлаўна Апанасевіч.

Ідэальная мадэль сям'і ва ўяўленні ўдзельнікаў апытання складаецца з 4 чалавек, двое з якіх разнаполыя дзеці. Спрыяльны ўзрост для ўступлення ў шлюб — 24—25 гадоў для жанчын і 27—28 гадоў для мужчын, бо трэба, каб і жаніх, і нявеста мелі пэўны матэрыяльны фундамент. Адносіны ў сям'і павінны быць дэмакратычнымі, калі рашэнні прымаюцца на аснове абмеркавання праблем, з улікам ініцыятыў і меркаванняў усіх членаў сям'і. Такімі бачаць свае сем'і старшакласнікі гімназіі № 1 Жодзіна.

Таццяна і Лізавета паспрабавалі таксама прасачыць, як уплывае сапраўдная сям'я на ўяўленне аб ідэальнай. Аказалася, што нярэдкія выпадкі, калі мадэль рэальнай сям'і падлетка, на жаль, не з'яўляецца для яго прыкладам.

Акрамя таго, 58% рэспандэнтаў выказалі станоўчыя адносіны да грамадзянскіх шлюбаў, а 79% нейтральна ўспрымаюць аднаполыя шлюбы. І гэта вельмі непакоіць аўтараў даследавання, паколькі пагражае традыцыйнай сям'і (з гэтай занепакоенасці, уласна кажучы, і пачалася іх работа). У сувязі з гэтым зараз дзяўчаты распрацоўваюць разам з псіхолагамі гімназіі праграму, мэтай якой з'яўляецца распаўсюджанне каштоўнасцей традыцыйнай сям'і.

У Нацыянальнай акадэміі навук Таццяна Сушко і Лізавета Стома не ўпершыню: у чэрвені 2011 года яны ўдзельнічалі ў рабоце летняй школы, дзе юных даследчыц вучылі правільна рыхтаваць і прэзентаваць праекты.

Зрэшты, нягледзячы на тое, што дзяўчаты яшчэ толькі ў 10 класе, у іх ужо ёсць вопыт рэалізацыі ўласнага праекта, які мае добрыя камерцыйныя перспектывы. З дапамогай настаўніцы англійскай мовы Святланы Віктараўны Вярбіцкай яны распрацавалі і стварылі серыю арыгінальных паштовак з беларускімі славутасцямі, якімі плануюць зацікавіць турыстаў. Хутка паштоўкі паступяць у продаж!

**Іна НІКІЦЕНКА.**
*nikitsenka@ng-press.by*
**Фота Алега ІГНАТОВІЧА.**

Іна Нікіценка. Якімі бачаць свае будучыя сем'і старшакласнікі